# Літаратуразнаўства

УДК 882.6-1(091)

**Г.П. Харошка**

# Праблема «чалавек і прырода» ў беларускай паэзіі другой палавіны XX стагоддзя

**Мэта** дадзенага даследавання – выяўленне праблемы ўзаемаадносін чалавека і прыроды ў творах беларускіх паэтаў другой палавіны XX ст. Актуальнасць дадзенай тэмы абумоўлена тым, што гармонія чалавека і прыроды набывае сёння ўсё большую каштоўнасць у грамадстве, бо па-за прыродай не ўяўляецца жыццядзейнасць чалавека, не можа развівацца яго сацыяльная практыка.

Нягледзячы на тое, што чалавек выйшаў з першабытнага стану і ўступіў у канфлікт сацыяльных сувязей і зносін, «ён у той жа час не змог адарвацца ад прыроды, бо плоццю, кроўю і мозгам належыць ёй і знаходзіцца ўнутры яе» (Ф. Энгельс). Сапраўды, прырода істотна ўздзейнічае на фізіялагічную і псіхалагічную аснову чалавека, фарміруе гнуткія пачуцці, якія ў сваю чаргу абумоўліваюць праяўленне гуманнасці і справядлівасці. Яна выхоўвае высокія маральныя і эстэтычныя ўласцівасці. Менавіта ў гэтым выражаецца адзінства прыроднага і сацыяльнага ў чалавеку. Таму ў наш час людзі павінны разумець велізарныя маштабы ўласнай дзейнасці і адказнасць за акаляючы свет. Толькі ў прыродзе, падкрэсліваў рускі пісьменнік С. Залыгін, чалавек бачыць «адзіны варыянт нашага існавання» [1]. З довадам мастака нельга не пагадзіцца.

Разам з тым у некаторых месцах актыўнае ўмяшанне чалавека ў жыццё прыроды (асабліва ў другой палове XX стагоддзя ды і ў наш час) спарадзіла шэраг нездаровых у ёй сімптомаў. А гэта, у сваю чаргу, стала моцна хваляваць многіх дзеячаў навукі, культуры і мастакоў слова. Пісьменнікі імкнуліся дапамагчы чалавеку больш глыбока адчуць і зразумець прыгажосць прыроды, яе зямную непаўторнасць; паўней ўсвядоміць неабходнасць чалавечых адносін да акаляючага свету, рацыянальна выкарыстоўваючы яго багацці. Бо прырода – гэта ўмова жыцця, дадзенага грамадствам. Яна – частка радзімы, сведка гістарычных падзей, сацыяльных пераўтварэнняў, удзельніца руху грамадства наперад. І ўрэшце рэшт, прырода – прадмет мастацтва, крыніца натхнення.

**Мастацкае асэнсаванне прыроды** пачыналася ў свой час са звычайнага славеснага асэнсавання пейзажу. І ў такой форме яно існавала вякамі. Асаблівага росквіту ў рускай літаратуры пейзажная лірыка дасягнула ў XIX стагоддзі ў творчасці А.С. Пушкіна, М.Ю. Лермантава, А.А. Фета, Ф.І. Цютчава, І.С. Нікіціна, Я.А. Баратынскага, С. Ясеніна, а ў беларускай у пачатку XX стагоддзя ў творах Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча, Цёткі і інш. Створаныя імі творы насілі больш прыродаапісальны характар і былі ў той час своеасаблівай падсведкай унутранага стану чалавека, а пазней – як сродак псіхалагічнага выяўлення грамадскай свядомасці. Мастацкае асэнсаванне прыроды не страціла сваіх эстэтычных каштоўнасцей і ў наш час. Водгукі прыродных страсцей асабліва моцна загучалі ў паэзіі П. Броўкі,

Р. Барадуліна, Г. Бураўкіна, А. Вярцінскага і інш. Але ў параўнанні з папярэднім часам, іх творы набываюць іншую танальнасць, больш напаўняюцца глыбокім філасофскім зместам. Чалавек у творах такога тыпу непарыўна звязаны з прыродай, бо бачыць у ёй сваю жыццёвасць. А як вядома, жыццёвасць прыроды выражаецца ў тым, што яна ўся – ад элементарных часцінак да велічэзных галактык – знаходзіцца ў стане руху, безупыннай змены і развіцця, адзінства і супярэчнасці і ўнутранай гармоніі, парадку і ўзгодненасці, спакою і «беспакою», задавальнення і прагі.

Сёння паэзія павінна развіваць і ўдасканальваць пачуццё прыроды, вучыць чалавека разумець яе непаўторнасць шукаць адзінства, гармонію, а таксама супярэчнасці паміж прыродай і грамадствам. Таму паэты па-свойму імкнуліся адлюстраваць з’явы акаляючай рэчаіснасці, шукаць адметныя мастацкія сродкі ўвасаблення прыроды ў вершаваным радку. У паэзіі яна стала ледзь не галоўным героем. Відаць, гэта тлумачыцца тым, што «прырода з`яўляецца маці для людзей, бо яна іх нарадзіла, у людзях працягвала і развівала свае патэнцыі, свае магчымасці, – піша У. Тугарынаў. Адзінства чалавека і прыроды, – працягвае філосаф, – заключаецца не толькі ў тым, што ён жыве ў прыродным асяроддзі, але і ў значна глыбокім сэнсе – у тым, што ён і целам падобны прыродзе, што ў ім прырода выражае сябе» [2].

Гэты настрой асабліва выразна адбіўся ў паэзіі беларускіх аўтараў у другой палове XX стагоддзя. Так, у апісанні роднай прыроды П. Броўка працягвае лепшыя традыцыі нацыянальнай класікі. Чытаючы яго вершы, мы быццам бы выходзім да неабсяжных прастораў палёў, удыхаем свежасць лясоў, ахопліваем зрокам простую і неабсяжную прыгажосць роднай зямлі. Пачуццё гонару за гэту зямлю, вялікая любоў да яе, адчуванне зліцця з яе лёсам – вось тое галоўнае, што нясуць у сабе творы паэта. Ён піша:

*Гляжу на ўсё жывое, гляжу на дрэвы, на траву*
*І я між іх, табой узняты, тваімі сокамі жыву.*
*Карэннямі ў глыбі сабраны, святло вітальнае я стрэў,*
*Табой, як зерне, узгадаваны, узрос, напіўся і даспеў.*
*А ты дала рукам работу, каб мог я заўжды працай жыць,*
*Дала кавалак хлеба ў рукі і конаўку вады з крыніц.*
*Паслала мне дзеля спачынку на бравінах шызы мох,*
*Каб заўжды я знайшоў прытулак, з цяжкіх вярнуўшыся дарог.*
*Дала мне спеў гаёў, дуброваў, што век яго не разгадаць,*
*І кветак шмат параскідала, што іх ніколі не сабраць [3].*

У прыведзеным прыкладзе верша міжвольна ўзнікае мараль: зялёныя дрэвы, травы і жывы чалавек, прыроднае адлюстроўваецца ў чалавечым, а чалавечае ў прыродным – такая ўзаемасувязь, такое адзінства жыцця. Больш таго, прырода ў творах беларускіх аўтараў, як і ў іншых літаратурах, нясе прыкметы нацыянальнага характару, выступае як сродак выяўлення нацыянальнага – патрыятычных пачуццяў. «Прырода, – піша У.П. Тугарынаў, – свяшчэнна. Мы часта і справядліва гаворым аб Радзіме, як аб святым паняцці, але ж Радзіма – частка прыроды» [2, с. 20]. Менавіта такой паўстае радзіма і ў творах Г. Бураўкіна. Ён параўноўвае сваю Беларусь з краявідамі Прыбалтыкі і Крыма – і ў кожным маляўнічым кутку іншых народаў бачыць яе велічавай і непаўторнай. Аўтар супраць абмежаванасці, духоўнай слепаты да прыроды, яе прыгажосці. Яго лірычны герой – выразнік гуманістычных ідэй, носьбіт лепшых рыс характару беларуса.

*Я ўдзячны лёсу, што ва ўсе часы*
*Мая блакітнавокая радзіма*
*Не засланіла мне чужой красы,*

*Мяне ад свету не адгарадзіла [4].*

Прырода ў вершы паэта як бы «салідарызуецца» з актыўным пачаткам чалавека, абуджаючы ў ім прагу жыцця і надзеі. У хвіліны смутку і тугі яна не проста хавае і выратоўвае героя ад нягод, але і вяртае яго да жыцця, дапамагае асэнсаваць тое, што адбылося, знайсці душэўную раўнавагу і сабрацца з сіламі для актыўнай дзейнасці ў імя жыцця і шчасця на зямлі.

Майстры паэтычнага слова стваралі вершы, дзе не толькі раскрываецца дыялектычнае адзінства чалавека і прыроды, яны імкнуліся па-мастацку паказаць прыроду, якая садзейнічае фарміраванню маральных якасцей у чалавеку. Р. Барадулін справядліва па гэтым пытанні пісаў: «Рукой да сасны дакраніся – быліну даверыць яна» [5]. З паэтам нельга не пагадзіцца. Французскі філосаф Ж.-Ж. Русо ў рамане-трактаце «Эміль, ці Аб выхаванні» гаварыў аб натуральным выхаванні дзіцяці «на ўлонні прыроды», згодна з прыродай, бо, паводле яго думкі, прырода дапамагае фарміраванню ў чалавеку душэўнай чысціні, праўдзівасці і іншых маральных якасцей. Такой думкі прытрымліваецца і рускі пісьменнік Л. Лявонаў, які сцвярджаў, што «чалавек, які разумее прыроду, – становіцца больш высакародным, чысцейшым. Ён не зробіць благога ўчынку, бо прайшоў душэўны універсітэт» [6]. Таму пытанне маральнага выхавання чалавека павінна быць першародным, і задача перад намі – ахоўваць прыроду і рацыянальна выкарыстоўваць яе багацці.

Не менш важнае месца ў творчай практыцы беларускіх паэтаў займае эстэтычнае асэнсаванне прыроды, яе ўздзеянне на розум і сэрцы людзей. Разуменне і ўспрыманне прыгожага – неад’емная рыса асобы любога грамадства. Прыгожае, валодаючы вялізнай прыцягальнай сілай, ва ўсе часы прываблівала і цягнула да сябе чалавека. У эпоху навукова-тэхнічнага прагрэсу яно набывае асаблівую важнасць, паколькі дае чалавеку адчуванне паўнаты быцця, служыць для ўсебаковага яго развіцця. З дзіцячых год, гаворыцца ў паэтычных радках П. Панчанкі, прырода «спрадвеку ўсім сэрцам трывожыла першароднай турботнай красой», і ляжыць яна «ў вяках сінявокіх лясоў» [7]. Сапраўды, як жа не пісаць, калі рака, луг, поле, лес – гэта тое, што спадарожнічае з дзяцінства, фарміруе свет нашых уражанняў і пачуццяў. У памяці кожнага чалавека гэты свет застаецца назаўсёды. Мы ахвотна «сілкуемся» гэтай непаўторнай красой прыроды, якая ўсё больш глыбока і поўна адкрывае нам свае законы, свае далягляды неразгаданых таямніц. «Вось чаму чалавек, – як справядліва сцвярджае І. Кузьмічоў, – павінен сёння безагаворачна паверыць у гаючасць яго кантактаў з жывой прыродай і прыняць гэта як маральную аксіёму» [8]. Таму творцы ўсё больш настойліва абуджаюць у слове грамадскую свядомасць, заклікаюць нас прачнуцца ад бестурботнасці, аглядзецца навокал сябе, прааналізаваць маральны сэнс адносін чалавека і прыроды. Бо ў некаторых выпадках мы (свядома і несвядома) парушаем экалагічнае асяроддзе, тым самым скажаем маральны кодэкс, які даўно ўстанавіўся і дзейнічаў у адносінах чалавека з прыродай. Яшчэ ў далёкім часе старажытнагрэчаскі філосаф Геракліт гаварыў, што прырода любіць хавацца. Магчыма, гэта так. Але зараз мы можам сказаць, што з кожным часам жыцця ёй становіцца ўсё цяжэй гэта рабіць, бо імкненне чалавека авалодаць таямніцамі прыроды ні на гадзіну не пакідае яго. І разам з тым расце клопат за лёс прыроды, за лёс усёй планеты. У свой час В.Р. Бялінскі абвінавачваў выдатнага рускага паэта Я.А. Баратынскага ў нігілізме, у недаверы да ролі навукова-тэхнічнага прагрэсу. Маецца на ўвазе верш «Прыкметы», дзе гаворыцца:

*Пока человек естества не пытал*
*Горнилом, весами и мерой,*

*Но детски вешчаньям природы внимал,*
*Ловил ее знаменья с верой;*
*Покуда природу любил он, она*
*Любовью ему отвечала,*
*О нем дружелюбной заботы полна,*
*Язык для него обретала…*
……………………………………………
*Но чувство презрев, он доверил уму;*
*Вдался в суету изысканий…*
*И сердце природы закрылось ему,*
*И ней на земле порицаний [9].*

У гэтых радках адчуваецца боязь і недавер паэта да тых перамен, якія адбываліся ў бурлівым XIX стагоддзі, калі на змену цяжкай паднявольнай ручной працы прыходзіла навука, эра тэхнікі. Аўтар тады далёка прадбачыў небяспечныя выдаткі навукова-тэхнічнага прагрэсу. Пазней гісторыя, час паправяць вялікага крытыка і пацвердзяць справядлівы, мудры тэзіс Я. Баратынскага. У беларускай паэзіі другой паловы XX стагоддзя, якой уласціва шукаць сэнс жыцця, гучаў голас трывогі за прыроду. «Калі да гэтага часу літаратура павінна была быць чалавечнай, калі можна сказаць – антрапалагічнай, – гаворыць С. Залыгін, – то зараз яна абавязана быць яшчэ больш, чым ніколі, прыроднай» [1, с. 251]. Таму так горача выступалі паэты ў абарону прыроды, у абарону яе першароднасці, шырэй – у абарону жыцця на зямлі.

**Абарона прыроды, абарона чалавека, абарона чалавечага ў самім чалавеку** – гэта асноўная думка, якая знаходзіцца ў многіх творах беларускіх майстроў паэтычнага слова ў другой палове XX стагоддзя. Чалавек, які шчыра любіць сваю радзіму, не можа здрадзіць сабе, грамадству, не можа быць раўнадушным у той час, калі з’яўляюцца песімістычныя настроі аб магчымым знікненні запаветных куткоў, якія былі радасцю і велічальным гонарам для многіх пакаленняў нашых продкаў. Аднак, на жаль, як піша П. Панчанка:

*Мой зялёны дружа,*
*Не зваліся людзі,*
*Што паскудзяць нам;*
*Тлушчам заплылі*
*І раўнадушшам,*
*Здрадзілі*
*Загінуўшым сябрам [7, с. 329].*

Паэт змагаецца з адмоўнымі з’явамі рэчаіснасці, судзіць некаторых людзей судом той гарманічнасці, якую ён знаходзіць у прыродзе, але якой часта не хапае чалавеку і грамадству. Абыякавасць у адносінах да будучага лёсу зямлі, бяздушнае знішчэнне таго, што нам дадзена прыродай, становіцца наглядным вырашэннем духоўнага апусташэння і маральнай убогасці людзей. Такі настрой, такая танальнасць думкі прысутнічаюць і ў вершах А. Вярцінскага, які піша:

*Не хочам мы любві ўзаемнай.*
*Ён (лес. – Г.Х.) нам – свае дары.*
*А што робім мы ў бары?*
*Да нас ён – з мірам і пакорай.*
*А мы да яго – з мячом.*
*А мы яго – пад корань, пад корань,*
*Пад самы корань сячом [10].*

У танальнасці твора А. Вярцінскага ўладарыць пачуццё агульнасці лёсу. Гэтая блізкасць пачынаецца з асаблівай пазіцыі аўтара, з асабістага пункту гледжання і асэнсавання свету. Выхаванне маралі ў чалавеку, на думку паэта, пачынаецца з беражлівых адносін да сябе падобнага.., «той, хто бязлітасны да прыроды, бязлітасны ўвогуле да ўсяго жывога». Гэты бок праблемы пацвярджаюць і словы С. Залыгіна, які пісаў: «Ты, чалавек, істота разумная і таму думкай сваёй ты павінен усведамляць законы прыроды і прызнаць іх справядлівымі, бо справядлівасць – гэта няўхільнае захаванне не чужых, а ўласных законаў і звычаяў, прырода ж тысячагоддзямі не здраджвае самой сабе, таму неабходна адносіцца да яе па справядлівасці, сумленна» [1, с. 175]. Менавіта таму большасць твораў падобнага тыпу – гэта асабістыя перажыванні мастакоў слова, іх гарэнне і пачуццё, унутраны боль, іх свет. В.Р. Бялінскі вельмі добра пра гэта пісаў: «Паэзія ёсць ні што іншае, як суб`ектыўнае, унутранае выражэнне самога паэта» [11]. І з гэтым довадам крытыка нельга не пагадзіцца. Пад уздзеяннем аб’ектыўных і суб’ектыўных прычын і абставін у паэта складваюцца пэўныя эмоцыі, якія ў час творчай працы ператвараюцца ў паэзію. «Паэт спачатку жыве, – далей сцвярджае А. Вярцінскі, – а потым ужо піша. Спачатку хвалюецца, а потым вылівае сваё хваляванне ў радкі. Спачатку назірае, думае, асэнсоўвае, а потым дзеліцца ў вершах сваім роздумам. Прычына – жыццё, вынік – верш. Другой залежнасці і паслядоўнасці тут няма» [12]. Перад намі лірычны верш А. Вярцінскага, які складаецца з дзесяці радкоў:

*Будзе шкада, як шкада бывае,*
*калі раптам гіне істота жывая.*
*Будзе шкада, як шкада бывае,*
*птушкі, якую хтосьці забівае,*
*дрэва, якое сякера сячэ,*
*слязы, што сцякае па шчацэ.*
*Будзе шкада, як шкада бывае*
*воблака, што ўдалеч сплывае...*
*Што нарабілі мы з табою!*
*Шкада да болю... [10, с. 38].*

Колькі эмоцыі і страсці ў вершы?

Гэта перш за ўсё ўнутранае жыццё чалавека, яго індывідуальнае перажыванне, яго ўнутраны воблік, адбіццё душэўнага стану, пачуцці і светаадчуванне; гэта вялікія трывогі, боль і смутак за родную прыроду, нашу зямлю. Верш па сваёй будове хоць і невялікі, але, гаворачы словамі таго ж В.Р. Бялінскага, «плён хвіліннага натхнення можа ўзрушыць усю нашу істоту, напоўніць сабой на доўгі час, калі для яго прачытання патрэбна больш за некалькі хвілін» [11, с. 46]. Сапраўды, глыбокая эмацыянальная напоўненасць радкоў твора прымушае нас суперажываць і думаць аб ім, шмат чаго разумець і аб многім задумацца. У гэтым і майстэрства любога паэта, які ў сціслай форме твора здолеў змясціць агульначалавечыя праблемы з глыбокім філасофскім падтэкстам. У працытаваных радках чуюцца адгалоскі экалагічных страсцей. Аўтар прымушае нас прыслухацца да важнай праблемы, сцвярджаючы, што чалавек павінен разумець законы развіцця прыроды, парушэнне якіх можа прывесці людзей да велізарных матэрыяльных і духоўных страт. Хіба не балюча бачыць абламаныя і паламаныя дрэвы, патаптаныя паляны, разбураныя птушыныя гнёзды, атручаныя прамысловымі адходамі рэкі. Але ж багаццямі прыроды карыстаемся і будзем карыстацца не толькі мы, але і нашы дзеці, дзеці нашых дзяцей і яшчэ многія і многія пакаленні. Таму з такой вялікай любоўю да прыроды, шчырым жаданнем зберагчы ў чысціне і красе векавечныя нашы рэкі прасякнуты наступныя крытычныя радкі:

*Нам рэкі – чыстую ваду,*
*нам рэкі – свой разліў блакітны,*
*мы ім – адходы і адкіды,*
*мы ім – усякую брыду.*
*Не скажаш, што любоў узаемная,*
*хутчэй за ўсё – наадварот [10, с. 14] –*

канстатуе паэт. «У цэнтры – мы, уладары, вакол – прырода, як імперыя, ляжыць, прынёсшы нам дары» [10, с. 15]. Адчуваецца страсны, ваяўнічы голас мастака, які дамагаецца таго, каб узаемасувязь чалавека з прыродай не была аднабаковай, а існавала паміж імі гарманічная ўзгодненасць. Якраз тут патрэбна тая вялікая любоў да прыроды, якая на мове вучоных называецца выхаваннем экалагічных пачуццяў, экалагічнага сумлення. Калі пануе такая згода, паразуменне, любоў і клопаты аб усім жывым, «тады сэрца паўнакроўна, тады рэкі поўны, серабрыцца плёс рачны» [10, с. 16]. Праўда, магчыма, тут адчуваецца нейкая доля рацыяналізму, ператвараючыся ў простыя павучальныя дэкларацыі. Але як бы там ні было, важна тое, што паэт прыходзіць да правільнага разумення, да глыбокай высновы. У гэтым выпадку нельга не пагадзіцца з крытыкам У. Гніламёдавым, які справядліва сцвярджае, што паэзія сёння «павінна быць па-сапраўднаму гуманістычнай, напоўненай мудрым чалавечым дзеяннем і эстэтычным хваляваннем – усім тым, што складае змест яе творчай актыўнасці, па якой можна меркаваць аб ступені развіцця чалавечай асобы, аб яе духоўным багацці, а значыць, і аб гуманістычнай канцэпцыі паэта» [13].

Як вядома, прырода не даруе нам бяздушных адносін, падчас варварства і вандалізму. Яна помсціць чалавеку, грамадству, калі да яе адносіцца не па-гаспадарску. Так званыя «перамогі» чалавека над прыродай нярэдка прыводзяць да таго, што адмоўныя вынікі пераважаюць часовыя выгады, атрыманыя чалавекам у працэсе ўзаемадзеяння з прыродай. Пра гэта ў свой час сцвярджаў Ф. Энгельс: «Не будзем, аднак, занадта спакушацца нашымі перамогамі над прыродай, за кожную перамогу яна нам помсціць. Кожная з такіх перамог мае, праўда, у першую чаргу тыя вынікі, на якія мы разлічвалі, але ў другую і трэцюю чаргу зусім іншыя, непрадбачлівыя вынікі, якія вельмі часта знішчаюць значэнне першых» [14].

**Заключэнне.** Наш час грунтуецца на ўсведамленні чалавекам жыцця як часткі прыроды. Таму ўсё больш павінна замацоўвацца ў нашым грамадстве канцэпцыя гарманічных узаемаадносін чалавека ў акаляючым асяроддзі, у аснове якой беражлівыя, рацыянальныя адносіны да прыроды. На сённяшні дзень важна, каб кожны чалавек мог умела карыстацца матэрыяльнымі і духоўнымі магчымасцямі, якія дае прырода. І беларускія майстры паэтычнага слова вельмі заклапочаны гэтым. Меры, якія прапаноўваюць творцы, падмацоўваюцца верай у разумнае вырашэнне супярэчнасцей паміж прыродай і грамадствам.

Чалавек заўсёды будзе з хваляваннем узірацца ў абрысы роднай зямлі, прыроды, апяваць яе прывольную казачную прыгажосць, думаць пра будучае, таму што ён і прырода – непарыўнае адзінае цэлае, таму што кожны з нас – часцінка гэтага адзінага прыгожага складанага і непаўторнага свету. Заканчваючы размову пра ўзаемаадносіны чалавека і прыроды, хочацца нагадаць цудоўныя радкі выдатнага рускага паэта XIX стагоддзя І.С. Нікіціна, які глыбока разумеў і цаніў прыроду:

*Пойми живой язык природы –*
*И скажешь ты: прекрасен мир! [15]*

З гэтай думкай паэта нельга не пагадзіцца, яна блізкая і сугучная з думкамі беларускіх майстроў вершаванага слова.

## ЛІТАРАТУРА


1. ***Залыгин, С.*** Литература и природа / С. Залыгин // Нева. – 1980. – № 5. – С. 172.
2. ***Тугаринов, В.П.*** Природа, цивилизация, человек / В.П. Тугаринов. – Л., 1978. – С. 16.
3. ***Броўка, П.*** Збор твораў: у 7 т. / П. Броўка. – Мінск, 1976. – Т. 3. – С. 474.
4. ***Бураўкін, Г.*** Вершы пяці кніг / Г. Бураўкін. – Мінск, 1976. – С. 205.
5. ***Барадулін, Р.*** Абсяг / Р. Барадулін. – Мінск, 1973. – С. 73.
6. ***Федорова, Н.*** Охраняя природу / Н. Федорова // Правда. – 1971. – 1 июля. – С. 3.
7. ***Панчанка, П.*** Выбранае / П. Панчанка. – Мінск, 1975. – С. 305.
8. ***Кузьмичев, И.*** Стремясь к согласованию с природой / И. Кузьмичев // Нева. – 1980. – № 12. – С. 183.
9. ***Баратынский, Е.А.*** Стихотворения / Е.А. Баратынский. – М., 1986. – С. 245–246.
10. ***Вярцінскі, А.*** Святло зямное / А. Вярцінскі. – Мінск, 1981. – С. 140.
11. ***Белинский, В.Г.*** Полн. собр. соч. / В.Г. Белинский. – М., 1954. – Т. 5. – С. 12.
12. ***Вярцінскі, А.*** Высокае неба ідэала / А. Вярцінскі. – Мінск, 1980. – С. 216.
13. ***Гніламёдаў, У.*** Лірычны характар / У. Гніламёдаў // Сучасная беларуская паэзія. – Мінск, 1970. – С. 62.
14. ***Маркс, К.*** Соч. / К. Маркс, Ф. Энгельс. – 2-е изд. – М., 1961. – Т. 20. – С. 495–496.
15. ***Никитин, И.С.*** Сочинения / И.С. Никитин. – М., 1980. – С. 79.



## S U M M A R Y

*In the article the problem of relations between man and nature is considered and revealed on the base of Belarusian poets' works such as P. Brovko, P. Panchenko, G. Baradulin, G. Buravkin and A. Vertinsky. The author also emphasizes the importance and vital characteristics of this problem.*



*Поступила в редакцию 14.01.2009*